УДК 398.432

*Т.І.БАЛДЫШЭЎСКАЯ*

# РУСАЛКА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ МІФАЛОГІІ

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імені А.А. Куляшова

Са старажытных часоў нашы продкі сустракалі шмат загадкавага і таемнага ў акаляючым свеце, надзялялі свядомасцю разнастайныя прадметы і з'явы, з павагай і страхам адносіліся да прыродных з'яў, адухаўлялі дрэвы, расліны, пакланяліся рэкам, крыніцам. Адлюстраванні вобліку чалавека, а таксама дрэў і жывёл у вадзе ракі і возера, іншы раз прымалі незвычайны выгляд і тым самым стваралі глебу для ўзнікнення ўяўнага свету вадзяных істот (вадзянікоў, русалак). Усе няшчасці, якія здараліся з людзьмі на вадзе, прыпісваліся менавіта гэтым дэманалагічным персанажам.

"Язычніцкія народы старажытнасці, – пісаў М.Забылін, – пакланяліся вадзе як неабходнаму з прадметаў існавання і аднаму з лепшых і самых спрыяльных шляхоў, як зімой, так і летам, нарэшце як стыхіі, якая жывіла глебу і раслiннасць, складалі павер'і, што рэкі, пачынаючы з індыйскага Гангеса або Ганга і егіпецкага Ніла да славянскага Дуная, Нёмана і іншых свяшчэнных у язычніцтве рэк, азёраў і крыніц населены рознымі істотамі, што над вадою ўладараць асобныя боствы, ды і самі рэкі ў некаторых народаў абагаўляліся [19, с.57].

Прычыны засялення воднай сферы істотамі ніжэйшай міфалогіі раскрывае ў сваіх працах А.Афанасьеў. "У сілу таго, – зазначае ён, – як паэтычныя ўвасабленні, што датычыліся рэк, азёраў, крыніц, усё больш і больш аддзяляліся ад сваёй стыхійнай асновы і атрымлівалі ў пераканаццях масы незалежнае, самастойнае быццё, воды сталі разглядацца як жыллё гэтых выдуманых істот. Самыя звычайныя жыццёвыя акалічнасці патрабавалі, каб чалавек пасяляўся каля вады. Потым духі – жыхары калодзежаў, вадаёмаў, азёраў і рэчак, ля якіх сяліліся родзічы, былі іх такімі ж блізкімі боствамі, як і полымя, што разводзілі на сямейным ачагу" [2, с.409].

Лічылася, што прырода як жывая істота можа спачуваць чалавеку або быць варожай, але ніколі не застаецца абыякавай у адносінах да людзей. Улічваючы небяспеку, якую несла водная стыхія, людзі пакланяліся вадзе і вадзяным духам, імкнуліся задобрыць іх.

З гэтай нагоды ў помніках старажытнай культуры славян часта ўпамінаецца вадзяны культ. У народнай свядомасці ён сустракаецца ў дзвюх розных формах; па-першае, як пакланенне вадзе (рацэ, калодзежу, возеру, крыніцы) непасрэдна. Даследуючы старажытнаславянскія помнікі, на гэта ўказвалі Е.Анічкаў і Н.Гальковскі [1, с.202; 6, с.47]. Па-другое, некаторыя помнікі "гаварылі не пра

культ вады, а пра нейкія ўвасабленні сілы вады ў выглядзе асобных істот: або прама ўвасабляецца рака, або абагаўляліся асобныя жаночыя вадзяныя духі, якія прымушаюць успомніць пра вядомых нам па казках русалках" [1, с.293].

Пакланяючыся вадзе і лесу непасрэдна, нашы продкі верылі, што "ў вадзе жылі русалкі і вадзянікі, а ў лесе лесавікі і часова русалкі" [6, с.59].

Адным з найбольш цікавых і загадкавых вобразаў воднай стыхіі, ва ўяўленнях нашых продкаў, лічыцца русалка. Вобраз русалкі з'яўляецца агульнаславянскім (а, магчыма, і агульнаіндаеўрапейскім), бо вобразы-аналагі гэтых дэманалагічных істот сустракаюцца ў культурах іншых народаў.

С.Токараў адзначаў, што ўжо з часоў работ Міклошыча (1864), Весялоўскага (1880) і іншых даследчыкаў стала відавочным, што нельга зразумець павер'яў пра русалак і звязаныя з імі абрады, калі не ўлічыць уздзеяння антычнай і раннехрысціянскай абраднасці на славян [27, с.212]. Можна меркаваць, што павер'і пра русалак узніклі з адной агульнай крыніцы. Калі і адбыліся некаторыя змяненні ў іх характарыстыцы то, несумненна, гэта ўздзеянне духу народнасці, клімату, глебы, умоў жыцця, адукаванасці людзей і інш.

Вычарпальнага даследавання вобраза русалкі няма і да цяперашняга часу. Гэта тлумачыцца, па-першае, тым, што беларуская міфалогія амаль увогуле не распрацоўвалася ў тэарэтычным плане. Даследаванні вобраза русалкі XIX стагоддзя, якія належалі пяру П.Шэйна і М.Нікіфароўскага, Е.Ляцкага і Е.Раманава, А.Багдановіча і В.Невяровіча, А.Васільевай і Д.Булгакоўскага, М.Шаховіча і І.Эрэміча і іншых аўтараў, у большасці выпадкаў насілі чыста апісальны, паведамляльны характар і ніякай тэарэтычнай апрацоўцы ўвогуле не падвяргаліся. Па-другое, уплывала недастатковасць сабранага матэрыялу; па-трэцяе, аднабаковы падыход да аналізу вобраза.

Сам вобраз русалкі даволі складаны і супярэчлівы. Э.Памеранцава канстатуе, што "русалка – адзіны вобраз народнай дэманалогіі, які ўвайшоў у песні і каляндарныя абрады, а былічкі пра русалак у параўнанні з былічкамі пра дамавых, лешых і інш. зусім нязначныя і аднастайныя, сюжэтна не развіты. Гэта вынік розных генетычных вытокаў гэтых вобразаў" [15, с.76].

Цяжэй за ўсё растлумачыць, на думку Л.Вінаградавай, факт спалучэння дзвюх, здавалася б, разнапланавых па сваіх генетычных вытоках элементаў: маністычная аснова (г.зн. душы памерлых) і сувязь з вегетатыўным культам (знаходжанне русалак у жыце, на галінах дрэў, абрады з троіцкай бярозкаю) [5, с.89]. Спалучэнне ў вобразе русалкі рысаў духаў прыроды з рысамі злос-ных духаў вылучае Е.Кагароў, сцвярджаючы, што ў русалках "народная вера ўгледжвае душы жанчын і дзяцей, якія загінулі несвоечасовай або ненатуральнай смерцю, але якія ў той жа час цесна звязаны з пакланеннем вадзе" [10, с.7].

Звярнуўшыся да сусветнай міфалогіі, заўважаем наяўнасць персанажаў, блізкіх да вобразаў русалак. Д.Зяленін прытрымліваецца думкі, што, па сутнасці, "вобраза, цалкам суадноснага русалцы, у другіх народаў няма, але існуюць функцыянальна блізкія ім аналагі" [9, с.209]. Перш чым вызначаць тыпалагічныя паралелі вобразу русалкі ў сусветнай міфалогіі, мэтазгодна ўстанавіць дамінантныя рысы ў яе вобліку і функцыях.

У народнай свядомасці русалка часцей усяго ўяўлялася або ў выглядзе маладой прывабнай дзяўчыны ці жанчыны з доўгімі валасамі, або ў вобліку касматай, брыдкай жанчыны. Яе традыцыйнымі функцыямі лічацца, з аднаго боку, імкненне спалохаць чалавека, завабіць у лес або да ракі, утапіць, заказытаць да смерці, украсці дзіця, сапсаваць пасевы і жывёлу; з другога, – ахоўваць збожжавыя палі ў час красавання, або нават садзейнічаць цвіценню і ўраджаю.

Д.Зяленін прыходзіць да высновы, што "міфалагічны вобраз русалкі складаны. У ім адлюстраваліся якасці і прыкметы некаторых мясцовых духаў-поўдзеніц, лешых, вадзянікоў; адбілася ўздзеянне старажытнагрэцкіх краін" [9, с.209].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Трэба адзначыць, што ў вобразе русалкі адлюстраваліся "не толькі агульнаславянскія рысы, але і жаночы дэманічны вобраз, звязаны з вадой, які вядомы фальклорнай традыцыі многіх народаў" [15, с.77].

Зыходзячы з гэтага, пры разглядзе вобраза русалкі, мы лічым мэтазгодным выкарыстоўваць двухбаковы падыход: генетычны і функцыянальны. Даследаванне вобразаў-аналагаў таямнічай істоты ў культурах народаў свету, якія дзе ў большай, дзе ў меншай ступені нагадваюць русалку або сувяззю з вадой, з лесам, з полем, або сваім знешнім выглядам, паходжаннем ці неадназначнасцю ў адносінах да чалавека, варта правесці шляхам параўнальнага аналізу.

З генетычнага пункту гледжання русалкі, па-першае, узыходзяць да вадзяных жаночых боствау. Яны з'яўляліся на зямлі тады, калі быў патрэбны дождж ці садзейнічанне будучаму ўраджаю. Па-другое, трэба ўлічыць і той факт, што "сувязь русалак з полем, жытам указвае і на наяўнасць у іх складаным вобразе і іншага аспекта – яны з'яўляюцца боствамі ўрадлівасці" [28, с.92]. Па-трэцяе, назіраецца сувязь русалак з духамі продкаў, паколькі яны з'яўляліся душамі памерлых.

Як бачым, "разнастайнасць генетычных прадпасылак вобраза стварыла яго невыразнасць, туманнасць, іншы раз нават супярэчлівасць" [15, с.76].

Наша даследаванне будзе праводзіцца на аснове разгляду і супастаўлення дэманалагічнага персанажа русалкі з вобразамі-аналагамі сусветнай міфалогіі..

Каб паказаць генетычную сувязь русалак з вадзянымі жаночымі боствамі, звернемся да аналізу такіх функцыянальна блізкіх іх аналагаў у міфалогіі народаў свету, як пэры, апсары, албасты, псыха-гуаша, наяды, ундзіны; сувязь з боствамі ўрадлівасці прасочым пры супастаўленні з вобразамі дрыяд, канцінь, нораў-ава, поўдзеніц; як дэманалагічнай істоце, звязанай з замагільным светам, русалцы суадносяцца бахалдой, лемуры.

Паводле народных сведчанняў, даволі цікавым вобразам персідскай ніжэйшай міфалогіі з'яўляецца пэры – супярэчлівая па сваім характары істота: з аднаго боку, "пэры – добрая фея, якая ахоўвае людзей ад "злых духаў" [20, с.486]; з другога, – "PARIKA...pairika – ведзьма, пэры"[23, с.295].

У персідска-таджыцкай паэзіі падаецца станоўчае значэнне пэры, якая вельмі прыгожая, прывабная, часам робіць дабро, але здольна пазбавіць чалавека розуму.

У народных уяўленнях белуджаў, пэры-крылатыя, вельмі прыгожыя жанчыны. Яны жылі ў паветры і "не садзіліся на зямлю" [4, с.126]. Пэры з'яўляліся да юнака або нават да мужчыны часцей у сне ў выглядзе прыгажуні. Паводле народнага: "Калі хто закахаецца ў пэры, сохне, становіцца хворым і памірае. Часам, наадварот, пэры пакахае юнака. Тады яна дапамагае каханаму ва ўсіх справах і садзейнічае яго поспеху ў жыцці" [12, с.93; 7, с.226].

Таджыкі і ўзбекі лічылі, што пэры бываюць і злыя, і добрыя. Добразычлівыя пэры ўяўляліся прыгожымі дзяўчатамі або маладымі жанчынамі ў белай, блакітнай ці чырвонай вопратцы. Іншы раз можна было сустрэць павер'і, дзе духамі-пэры былі прыгожыя юнакі. А.Сухарава адзначала, што пэры маглі закахацца ў зямных мужчын або жанчын і жыць з імі [24, с.41-42].

У вераваннях язгулемцаў, калі пэры выходзіць замуж за юнака, ён павінны даць слова, ў пэўны час не глядзець на яе, бо яна ў вызначаны момант скідвае покрыва і ўсё навокал запаўняецца ззяннем [29, с.185-186].Злыя пэры, па народных пераказаннях,маюць непрыгожы, пачварны знешні выгляд і брудную вопратку.

У ваханцаў існавала павер'е, якое атаясамлівала пэры з нячыстай сілай. У ім сцвярджалася, што пэры жывуць у рацэ, выходзяць адтуль толькі ноччу, бо калі на іх падае сонечны прамень, яны страчваюць магчымасць рухацца [21, с.54-58]; а ў шугнанскай казцы адлюстравана вераванне, што на гары Каф жыве пэры, у якой, калі яна смяецца, з рота падаюць кветкі [21, с.69-70].

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

Для раскрыцця генезісу вобраза пэры вельмі істотным з'яўляюцца яе сувязь з вадой і кветкі, што падаюць з рота, калі яна смяецца.

Наконт гэтага У.Проп меркаваў, што сувязь смеху з кветкамі характэрна для фальклорных і міфалагічных персанажаў, пачынаючы з таго часу, калі грамадскія адносіны і формы мыслення адлюстроўваюць земляробчую вытворчасць: "Пераход да земляробства вядзе да рэзкага змянення форм вытворчасці грамадскіх адносін і форм мыслення. Магічнай сіле смеху да гэтага часу падуладна было толькі чалавечае жыццё. Цяпер жа ў арбіту смеха ўносіцца жыццё расліннасці. Жыццё расліннасці ставіцца ў залежнасць ад смеху [17, с.192].

Для Сярэдняй Азіі таксама ў сувязі з гэтым характэрна дачыненне пэры да вады – важнейшай крыніцы ўрадлівасці.

А.Бертэльс зазначаў, што персідскі фальклорны матэрыял пацвярджае сувязь пэры з вадой (дажджом, возерам, крыніцай) [4, с.126]. Між іншым, у народнай свядомасці нават існуе асобная разнавіднасць пэры – вадзяныя пэры, якія жывуць у рэках і іншых крыніцах і з'яўляюцца гаспадынямі вады.

Па заключэнню А.Бертэльса, ва ўяўленнях сярэдневяковых таджыцка-персідскіх паэтаў пэры вельмі прыгожая істота, якая сваім чароўным выглядам вабіць да сябе выпадковага гледача і здольна пазбавіць яго прытомнасці, розуму, зрабіць вар'ятам.

Супаставіўшы вобраз пэры з русалкай, трэба адзначыць, што гэтыя істоты, паводле народных уяўленняў, лічыліся нячысцікамі. Павер'і падкрэсліваюць начны характар пэры, страту імі актыўнасці пры святле. У большасці міфаў пэры – добразычлівыя да людзей, нават у чалавечым обліку ўступаюць у інтымную сувязь з імі. У той жа час яны імкнуліся ўкрасці маладых жанчын і дзяўчат.

Б.Ліцвінскі, вывучаючы вусна-паэтычную творчасць народаў Сярэдняй Азіі, зазначаў, што пэры мала шкодзяць людзям, насупраць, калі пэры сустрэнецца з чалавекам, яна становіцца падуладнай яму, прыносіць карысць, дапамагае па гаспадарцы [12, с.94].

Такім чынам, параўнаўшы вобразы русалкі і пэры, можна зрабіць вывад, што яны ў многім падобныя паміж сабой: па-першае, знешнім выглядам; па-другое, сувяззю з вадой; па-трэцяе, неадназначнасцю ў адносінах да людзей.

Заслугоўвае ўвагі сувязь русалкі і апсары. У індуісцкай і ведыйскай міфалогіі апсары – жаночыя духі вады, якія пражываюць пераважна ў небе. Месцам іх жыхарства на зямлі з'яўляюцца рэкі і горы. Па народных вераваннях, апсары – прыгожыя жанчыны, апранутыя ў багатае адзенне. Лічылася, што яны ўпрыгожваліся каштоўнасцямі і кветкамі, каб сваім чароўным выглядам уздзейнічаць на маладых мужчын і юнакоў.

Як бачым, тут яскрава прагледжваецца генетычная сувязь вобразаў русалкі і апсары ў адносінах да воднай стыхіі. У функцыянальным плане (імкненне зачараваць сваёй прыгажосцю) яны таксама вельмі падобныя між сабою.

Адметнымі вобразамі-аналагамі русалкі ў міфалогіі заходне-сібірскіх татар з'яўляюцца албасты – злыя духі, звязаныя з воднай стыхіяй. Знешні выгляд албасты блізкі да некаторых уяўленняў жыхароў беларускага Палесся пра русалку як пачварную, брыдкую жанчыну з непрывабнай знешнасцю: "албасты – пачварныя жанчыны з доўгімі распушчанымі валасамі і доўгімі, аж да кален, грудзьмі, цвёрдымі і вострымі пазногцямі на пальцах рук" [16, с.326].

Ва ўяўленнях таджыкаў, албасты з'яўляюцца ў обліку жанчыны з распушчанымі чорнымі валасамі, з доўгімі грудзьмі, якія яны закідваюць на прахожага, пасля чаго чалавек падае, цяжка хварэе.

Б.Ліцвінскі вызначае варожы характар албастаў: "Часцей за ўсё яны шкодзілі парадзіхам і нованароджаным" [12, с.102]. Лічылася, што сіла албасты сканцэнтравана ў кніжачцы, якую яны мелі пры сабе, у манеце або валасах. Адабраўшы амулет, чалавек поўнасцю падпарадкоўвае албасту сабе [25, с.102].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Надзвычай яскрава выяўляецца ў вобразе албасты яе сувязь з вадой. У народзе лічылі, што, каб вызваліцца ад яе ўздзеяння, трэба перайсці праз раку. Гэта дэталь, несумненна, падкрэслівае дачыненне дэманалагічнай істоты да вады.

Існуе павер'е, што албасты, завалодаўшы сэрцам і ныркамі жанчыны або нованароджанага, неслі іх да вады. Тут даволі цікавым з'яўляецца адзін момант – сувязь смерці чалавека з тым, паспее ці не албаста пакласці ўнутраныя органы ў ваду.

"Д.Зяленін у 1940 годзе ў вуснай гутарцы, – адзначае В.Сухарава, – выказаў меркаванне, што гэта рыса можа ўказваць на генетычную сувязь албасты з вадзянымі духамі: толькі дабраўшыся да вады, дэман трапляе ў сваю стыхію, у якой ён непераможны і можа канчаткова завалодаць тымі, чые вантробы шкраў" [25, с.33].

А.Розенфельд, даследуючы вераванні шугнанцаў і рушанцаў, пісаў, што, паводле народных уяўленняў, "албаста з'яўляецца вадзяным духам. Ратуючыся ад праследавання, яна скача ў ваду, і ў тым месцы...ўзнікае слуп полымя" [18, с.60].

Непасрэдную сувязь дэманалагічных персанажаў албастаў і русалак вызначае В.Гардлеўскі, даследуючы асманскую дэманалогію: "Албасты пражываюць каля рэк або іншых вадзяных крыніц. Звычайна яны, як і русалкі, з'яўляюцца перад людзьмі на беразе, расчэсваюць свае валасы. Іх можна было суцішыць і забраць да сябе дапамагаць па гаспадарцы" [8, с.313].

На функцыянальную роднасць албастаў і русалак і іх знешняе падабенства ўказвае Д.Зяленін: "Ласкатанне і непамерна вялікія грудзі, закінутыя на спіну, збліжае вобраз усходнеславянскай русалкі з міфалагічнымі персанажамі заходніх народаў: турэцкай "албастай", якая жыве ў балоце, з'яўляецца ў выглядзе голай жанчыны вялікага росту, з вялікімі адвіслымі грудзьмі" [9, с.153].

Такім чынам, прыходзім да высновы, што русалкі і албасты маюць блізкія моманты: знешняе падабенства, суаднесенасць з вадою, супярэчлівасць характару ў адносінах да чалавека.

У В'етнаме да нашых дзён захавалася вера ў канцінь – духа дрэва. Цікава, што знешнім выглядам і сваімі дзеяннямі канцінь нагадвае русалку. Паводле перакананняў народных дарадцаў, гэты дух асацыіруецца з прыгожай дзяўчынай, якая заваблівае да сябе адзінокіх маладых мужчын. Канцінь можа мець выгляд прыгожага юнака – спакушальніка адзінокіх падарожніц.

Г.Стратановіч, вывучаючы вераванні народаў Індакітая, адзначаў, што там захаваўся вобраз канцінь, што яна не мае ступняў ног. Яна ляціць, а не ідзе, не падымаючыся высока над зямлёю [22, с.32].

Трэба зазначыць, што вобраз русалкі і канцінь знешнім выглядам (прыгожыя дзяўчыны) і традыцыйнымі функцыямі (зачараваць, прывабіць) падобныя між сабою. Прычым, не з'яўляючыся духам лесу, русалка нагадвае канцінь, бо ў пэўны перыяд года жыве ў лесе.

Сучасны даследчык фальклору А.Ненадавец, разглядаючы ўспрыманне нашымі продкамі прыроды, лічыць, што, падзяляючы прыроду на дзве часткі, адносна якіх адна з іх была аддадзена добрым сілам, а другая – нячыстым, благім, старадаўні чалавек нават ні на хвіліну не сумняваўся ў там, што ўсё жывое навокал таксама павінна падзяляцца на добрае і благое. Калі з'явіліся ўяўныя міфічныя істоты, то наш продак і сярод іх шукаў (і знайшоў) станоўчае і адмоўнае. Адным міфалагічным персанажам адводзілася функцыя засцерагальная, ахоўная, а іншым – варожая, бязлітасная ў адносінах да людзей [14, с.139], а вобразу русалкі, на нашу думку, суджана займаць, паводле народных уяўленняў, прамежкавае становішча, паколькі яна – вобраз супярэчлівы: з аднаго боку, спрыяе ўрадлівасці зямлі, ахоўвае пасевы, з другога, – жорсткая ў адносінах да людзей.

Менавіта такой неадназначнасцю ў сваіх паводзінах нагадвае вобраз русалкі персанаж адыгейскай міфалогіі псыха-гуаша, якая жыве ў рэках, крыніцах. Яна

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

з'яўляецца захавальніцай водаў, загадвае дажджамі. Паводле народных уяўленняў, псыха-гуаша мела воблік прыгожай жанчыны з доўгімі валасамі, якія расчэсвала магічным грэбнем [13, с.345]. Дэманалагічная істота нічым не адрознівалася ад звычайнай жанчыны: яна ўступала ў інтымныя адносіны з мужчынамі, любіла смелых, мужных людзей. А вось калі чалавек, сустрэўшыся з ёй, палохаўся, яна гневалася і магла яго загубіць.

Вобраз псыха-гуаша, як і русалкі, узыходзіць да жаночых вадзяных бостваў. Падобныя гэтыя вобразы і знешнім выглядам, і адносінамі да людзей.

Сярод дэманалагічных персанажаў буратаў вобразам-аналагам русалкі лічацца бахалдой – вадзяныя духі – душы людзей, якія выпадкова ўтапіліся. У народнай свядомасці захавалася легенда, дзе яскрава вылучаецца сувязь бахалдой з воднай стыхіяй. У ёй расказваецца,як хлопчык Булагат кожны дзень хадзіў на бераг Байкала, вяртаючыся дамоў апоўначы. На запытанне маці, чаму ён спазняецца, хлапчук расказаў, што гуляе з хлопчыкам і дзяўчынкай, якія выходзяць з вады, і не заўважае, як праходзіць час. Яго маці падсцерагла дзяцей, калі яны з'явіліся на бераг.Калі ж возера расхвалявалася і разгневалася, жанчына змагла ўтрымаць хлопчыка, а дзяўчынка выслізнула з рук і знікла ў моры. Яна зрабілася бахалдой – захавальніцай воднай стыхіі Байкала [3, с.43].

У народнай свядомасці жывуць уяўленні пра бахалдой і як прадстаўнікоў "нячыстай сілы". Бураты верылі, што бахалдой ходзяць начамі на зямлі, любяць бываць на вечарынках, на вяселлях, нябачна прысутнічаюць пры выкананні ўсялякіх рэлігійных абрадаў. Калі на гэтых цырымоніях бахалдой далі што-небудзь, яны, задаволеныя, ціха выходзілі, калі не – шумелі, палохалі начамі падарожных [16, с.301].

Як бачым, русалкі і бахалдой маюць некаторыя рысы падабенства: па-першае, аднолькавае дачыненне да воднай стыхіі; па-другое, яны – істоты, звязаныя з замагільным светам.

Гаспадыняй поля ў мардоўскай міфалогіі лічыцца нораў-ава. Мардовы малілі яе аб ураджаі, прасілі дапамогі ў палявых работах. Для нораў-ава людзі астаўлялі ў полі нязжатыя палоскі, хлеб, каб выклікаць добразычлівыя адносіны, бо верылі, што дэманалагічная істота можа сапсаваць ураджай, пакараць чалавека сонечным ударам. Існавала павер'е, што ў час цвіцення жыта нораў-ава прадказвала ўрадлівасць начным свістам, а неўрадлівасць - крыкам, плачам [13, с.228]. Адсюль вынікае, што падабенства вобразаў русалкі і нораў-ава не выклікае сумненняў. Яны выконвалі функцыянальна аднолькавыя дзеянні: ахоўвалі пасевы, каб ніхто не атрасаў каласкоў, і акуль не нальюцца.

У грэцкай міфалогіі духамі прыроды з'яўляюцца наяды і дрыяды (другая назва – німфы). Наяды былі духамі крыніцаў і ручаёў, уладарылі над вадой. Некаторыя з іх нават валодалі крыніцамі, "воды якіх дапамагалі пры розных хваробах, лічыліся ачышчальнымі, нават маглі даравацъ бяссмерце" [13, с.205].Уяўляліся наяды прыгожымі дзяўчатамі, з доўгімі светлымі валасамі.

Трэба адзначыць, што не менш прываблівымі лічыліся і дрыяды – німфы дрэў. Старажытным грэкам уяўляліся яны таксама прыгожымі дзяўчатамі з доўгімі, але цёмнымі валасамі. Калі параўнаць русалак з наядамі і дрыядамі, то становіцца зразумелым, што сувязі, безумоўна, ёсць, і, перш за ўсё, гэтыя дэманалагічныя персанажы падобны знешнім выглядам. Яны прыгажуні з доўгімі валасамі, якія адрозніваюцца толькі сваім колерам. Наяды як німфы крыніцаў і ручаёў жывуць у чыстай празрыстай вадзе, таму маюць светлыя валасы; дрыяды жывуць у лесе, дзе мала сонечнага святла, і маюць цёмныя валасы; русалкі маюць зялёныя валасы, бо жывуць у рэках, дзе шмат водарасцяў.

Як і наяды, русалкі ўладарылі над вадой. Гэта дае падставы лічыць наядаў адным з праобразаў русалак.

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова

Трэба адзначыць, што, у адрозненне ад антычных вобразаў, усходнеславянскія русалкі цесна звязаны як з вадой, так і з лесам.

Наконт адносін русалак з дрыядамі варта зазначыць, што русалкі былі звязаны з лесам, аднак не з'яўляліся духамі дрэваў, і сувязь паміж імі праяўляецца больш у семантычным, чым у функцыянальным плане.

У рымскай міфалогіі захаваліся вераванні ў лемураў, якія нагадваюць русалак – "закладзеных" нябожчыкаў. Лічылася, што лемуры (ларвы) – шкодаsuccessful ценi, здані нябожчыкаў, якія не атрымалі належнага пахавання (злачынна забітыя, злодзеі і інш.).

Лемуры, як і русалкі, блукалі начамі, палохалі людзей, насылалі на іх вар'яцтва.

Вобраз лемураў удала выкарыстаны У.Караткевічам у аповесці "Ладдзя роспачы", каб раскрыць жахі апраметнай. Пісьменнік апісвае іх страшнымі, брыдкімі істотамі: "Белыя, нібы з нежывога парцалану злепленыя – людцы не людцы, а так, чорт ведае што, поскудзь з магутнымі мускуламі пад ліпучай скурай, з вялізнымі, нібы ў начных лемураў, вачыма, але затое з чарапамі, у якія наўрад ці ўлез бы хаця напарстак мазгоў. Яны засланялі вочы далонямі, але святло мацнела, і тады яны ў паніцы кідаліся некуды ў глыб апошняга мацерыка.

Лемуры з'явіліся зноў, і гэта былі другія лемуры, зусім без вачэй, з гладкай скурай на іх месцы" [11,с.108].

У.Караткевіч паказвае ў творы, што галоўны герой Гервасій Выліваха ўспамінае, як не выносіць самай маленькай гарачыні вечна халодная луска рыб, і, сарваўшы з грудзей зыркую, як жарынку, кветку шыпшыны (сімвал роднай беларускай зямлі), адганяе ёй дэманалагічных істот апраметнай: "І пачаў вадзіць ёю вакол сябе. Лемуры набліжаліся. Але вось завагаўся адзін ...другі ...трэці. Чацвёрты раптам зрабіў крок назад... Пачалі адступаць і другія" [11, с.109].

Ва ўяўленнях рымлян, лемуры асацыіраваліся з нячысцікамі, ад якіх можна вызваліцца толькі пры дапамозе магічных дзеянняў. Таму, каб выгнаць лемураў з хаты, гаспадар павінен быў устаць ноччу і тройчы вымыць рукі, узяць у рот чорныя бабы і, не павярочваючыся, кідаць іх праз плячо, дзевяць разоў паўтарыць, што гэтымі бабамі ён выкупляе сябе і сваіх блізкіх. Затым стукнуць па мядзянай місцы і дзевяць разоў заклікаць здань знікнуць з хаты [13, с.48].

Вельмі падобныя да русалак ундзіны (ад лац. unda – хваля). У народаў Заходняй Еўропы яны лічыліся духамі вады, уяўляліся ундзіны прыгожымі дзяўчатамі з рыбінымі хвастамі. Ноччу яны выходзілі з вады, расчэсвалі свае доўгія валасы, жалобнымі спевамі зачароўвалі падарожных, зацягвалі іх у ваду і рабілі сваімі каханкамі ці забівалі. Яны маглі атрымаць чалавечую душу, пакахаўшы і нарадзіўшы дзіця на зямлі.

Ідэя нараджэння дзіцяці на зямлі, як спосаб вяртання да чалавечага жыцця, прысутнічае ў беларусаў у трансфармаваным выглядзе (у лірычных песнях з зачынам "На граной нядзелі русалкі сядзелі...").

Бясспрэчна, падабенства ундзінаў і русалак не выклікае сумненняў. Гэтыя істоты блізкія знешне, звязаны з вадой, падобны ў функцыянальным плане.

Такім чынам, прыходзім да высновы, што ва ўяўленнях беларусаў пра русалку арганічна сінтэзаваны рысы і функцыі розных жаночых сусветных міфалагічных істотаў: па-першае, беларускія русалкі звязаны з вадой (як і наяды, псыха-гуаша, пэры, апсары, албасты, ундзіны),з лесам (як і дрыяды, канцінь) і полем (як нораў-ава); па-другое, назіраецца падабенства знешняга выгляду русалкі з адназначнымі персанажамі міфалогіі Сусвету; па-трэцяе, дваістыя адносіны беларускіх русалак да людзей (як і албастаў, ундзінаў); па-чацвёртае, ва ўяўленнях беларусаў, русалкі – "хадзячыя" нябожчыкі (як і бахалдой, лемуры). Вядома ж, да нашага часу дайшлі толькі драбніцы ад той першастваральнай міфалагічнай карціны, якую можна аднавіць толькі шляхам карпатлівай працы.

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імені А.А. Куляшова

## ЛІТАРАТУРА

1. ***Аничков Е.В.*** Язычество и Древняя Русь. – С-Петербург,1914.
2. ***Афанасьев А.Н.*** Живая вода и вещее слово. – М.,1988.
3. ***Балдаев С.П.*** Родословные предания и легенды. Булагаты и эхириты. Ч.1. – Улан-Удэ, 1970.
4. ***Бертельс А.Е.*** Пери // Культура и искусство народов Средней Азии в древности и средневековье. – М., 1979.
5. ***Виноградова Л.*** Мифологический аспект полесской "русальной" традиции // Славянский и балканский фольклор. – М., 1986.
6. ***Гальковский Н.М.*** Борьба христианства с остатками язычества в Древней Руси. Т.1. – Харьков, 1916.
7. ***Гафферберг Э.Г.*** Пережитки религиозных представлений у белуджей // Домусульманские верования и обряды в Средней Азии. – М.,1975.
8. ***Гордлевский В.А.*** Из османской демонологии. Т.3. – М., 1962.
9. ***Зеленин Д.К.*** Очерки русской мифологии. – П-г., 1916.
10. ***Кагаров Е.Г.*** Религия древних славян. – М., 1918.
11. ***Караткевіч У.*** Ладдзя роспачы. – Мн., 1997.
12. ***Литвинский Б.А.*** Семантика древних верований и обрядов памирцев // Средняя Азия и её соседи в древности и средневековье (история и культура). – М., 1981.
13. Мифы народов мира. Т.1,2. – М., 1980, 1982.
14. ***Ненадавец А.М.*** За смугою міфа. – Мінск, 1999.
15. ***Померанцева Э.В.*** Мифологические персонажи в русском фольклоре. – М., 1975.
16. Природа и человек в религиозных представлениях народов Сибири и Севера (вторая половина XIX – начало XX в.). – Л., 1976.
17. ***Пропп В.Я.*** Фольклор и действительность. – М., 1976.
18. ***Розенфельд А.З.*** О пережитках древних верований у припамирских народов. – СЭ, 1954. – №4.
19. Русский народ. Его обычаи, обряды, предания, суеверия и поэзия. Собр. М.Забылиным. Репринтное воспроизведение издания 1880 года. – М., 1990.
20. Словарь иностранных слов. – М., 1964.
21. Сказки народов Памира. – М., 1976.
22. ***Стратанович Г.Г.*** Народные верования населения Индокитая. – М., 1978.
23. ***Соколов С.Н.*** Язык Авесты: Учебное пособие. – Л., 1964.
24. ***Сухарева О.А.*** Ислам в Узбекистане. – Ташкент, 1960.
25. ***Сухарева О.А.*** Пережитки демонологии и шаманства у равнинных таджиков // Домусульманские верования и обряды в Средней Азии. – М., 1975.
26. ***Тайлор Э.Б.*** Первобытная культура. – М., 1989.
27. ***Токарев С.А.*** Религия в истории народов мира. – М., 1986.
28. ***Токарев С.А.*** Религиозные верования восточнославянских народов XIX – начала XX в. – М.-Л., 1957.
29. ***Эдельман Д.И.*** Язгулямский язык. – М., 1966.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова